Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 37 (28401)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СВЯТА, АВЕЯНАЕ МУЖНАСЦЮ

***Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!***

***Дарагія ветэраны! Паважаныя суграмадзяне!***

Ад усёй душы віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта свята, авеянае мужнасцю і доблесцю, мы заўсёды адзначаем з асаблівым пачуццём гордасці за нашых воінаў, якія ва ўсе часы надзейна забяспечвалі абараназдольнасць краіны і цяпер прадаўжаюць дастойна ахоўваць рубяжы нашай Радзімы.

Беларусь удзяляе першарадную ўвагу абароне нацыянальных інтарэсаў. У рэспубліцы створана надзейная сістэма бяспекі, ажыццяўляецца далейшае ўмацаванне Узброеных Сіл, удасканальваецца баявая падрыхтоўка ваеннаслужачых.

Асаблівыя словы ўдзячнасці — ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Сваёй самаадданасцю і гераізмам яны прадэманстравалі цяперашняму пакаленню салдат і афіцэраў прыклад сапраўднага патрыятызму і вернасці воінскаму абавязку.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту і новых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена ПЛІС, дырэктар інфармацыйна-турысцкага цэнтра «Мінск»:**

*«З увядзеннем пяцідзённага бязвізавага рэжыму ў Мінску чакаюць павелічэння прытоку турыстаў як мінімум на 15—20%. Акрамя традыцыйных праграм, якія сёння турфірмы прапануюць замежным грамадзянам, распрацоўваюцца новыя ідэі, што змогуць прыцягнуць дадатковыя патокі турыстаў, пазнаёміць іх з традыцыямі Беларусі, нацыянальнай культурай і звычаямі. Таксама разглядаюцца магчымасці рэалізацыі новых праектаў, звязаных з аграэкатурызмам, арганічнай сельскай гаспадаркай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8723 | ▼ |
| Еўра | 1,9698 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0693 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ На варце Айчыны

# Зачараваныя небам

### У ваенных верталётчыкаў, бацькі і сына Паўлавых, на дваіх — больш як 5 тысяч гадзін, праведзеных над аблокамі



Фота Надзеі БУЖАН.

**Яны ўдвух зачараваныя небам і не ўяўляюць сваё жыццё без вінтакрылых машын. Нягледзячы на тое, што Аляксандр Мікалаевіч сваё ўжо адлятаў, яго ўсё роўна цягне туды, дзе свішча вецер і гудзе матор. Выйшаўшы на ваенную пенсію, лётчык-снайпер прымяняе свой багаты вопыт у распрацоўцы авіятрэнажораў. Затое за дваіх лятае яго сын, які служыць у 50-й змешанай авіяцыйнай базе, што ў прысталічных Мачулішчах.**

### АД ЗАХАПЛЕННЯ ДА ВЫШЭЙШАГА ПІЛАТАЖУ

А пачалося ўсё са звычайнага юнацкага захаплення авіяцыяй, якое вылілася ў паступленне ў Сызранскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў.

— Здаралася, што ў школе прагульваў заняткі, — расказвае старэйшы Паўлаў. — Калі настаўнікі прасілі мяне растлумачыць прычыну, я казаў, што быў у ваенкамаце. І нехта нават пажартаваў: маўляў, лётчыкам будзеш, раз часта ў ваенкамаце бываеш!

Так і атрымалася. Праўда, стаў Аляксандр Паўлаў не лётчыкам, а верталётчыкам. Аб тым, што ў вучылішчы рыхтуюць кіраваць верталётамі, даведаўся, ужо калі быў залічаны ў рады курсантаў. Але аб гэтым ніколі не пашкадаваў.

Свой самы першы палёт старэйшы Паўлаў памятае і сёння. Было гэта на верталёце Мі-2. «Ляцелі тады з інструктарам, маладым лейтэнантам, які сам нядаўна скончыў вучылішча, — успамінае лётчык-снайпер. — Я сядзеў і трымаўся за кіраванне, ён пілатаваў. Потым і мне даў патрымацца за штурвал. Цікава было. Усё гэта вельмі заваражыла...»

Пасля заканчэння вучылішча ў Сызрані найлепшых выпускнікоў адпраўлялі служыць за мяжу. Аляксандр Паўлаў трапіў у Манголію. Ва Улан-Батары быў адразу прызначаны камандзірам экіпажа (авіятары з вышэйшай адукацыяй па тым часе былі ў дэфіцыце), а праз тры гады стаў лётчыкам першага класа.

СТАР. 4

■ Эксклюзіў

## У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

### Жыллёвыя крэдыты — на агульных падставах, дзяржаўная падтрымка — індывідуальна

**Сёлета ў сярэдзіне студзеня адпаведнай пастановай Саўміна быў зацверджаны комплекс мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020-я гады. У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, будзе прадугледжана замена льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва крэдытаваннем на рынкавых умовах з адраснай дзяржаўнай падтрымкай такіх асоб за кошт бюджэтных сродкаў. Пастанова ўдакладняе, што пераход да новага прынцыпу фінансавання жыллёвага будаўніцтва для «чаргавікоў» будзе рэалізаваны на працягу года.**



Якім чынам будзе працаваць новая сістэма дзяржпадтрымкі, а таксама аб планах спецыялістаў па будаўніцтве жылля ў нашай краіне на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказаў **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

***— Адразу паспрабуем падсумаваць, колькі ў краіне было пабудавана жылля летась і на якія аб'ёмы спецыялісты міністэрства разлічваюць сёлета?***

— Летась у Беларусі было пабудавана 4 млн 286 тысяч квадратных метраў жылля, — гэта на 7,1% больш за гадавы план. Заданне па жыллю з дзяржаўнай падтрымкай было перавыканана амаль на 18% (уведзена 991,3 тысячы квадратных метраў жылля).

СТАР. 2